# НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК!

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 31—32 (462—463) | Аўторак, 7 лістапада 1961 г. | Цана 2 кап.

## 31 кастрычніка XXII з'езд КПСС закончыў сваю работу

31 кастрычніка на ранішнім пасяджэнні з'езд заслухаў паведамленне старшыні падліковай камісіі тав. Дзёмічава П. Н. аб выніках выбараў цэнтральных органаў партыі.

Дэлегаты з'езда бурнымі, працяглымі апладысментамі сустракаюць паведамленне аб аднадушным выбранні членаў Цэнтральнага Камітэта КПСС, кандыдатаў у члены ЦК, членаў Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі.

Таварыш М. С. Хрушчоў адзначае, што аднадушнае галасаванне пры выбарах цэнтральных органаў партыі яшчэ раз сведчыць аб адзінстве і маналітнай згуртаванасці нашай ленінскай партыі. Ён ад імя выбраных таварышаў дзякуе дэлегатам з'езда за высокае давер'е.

На вячэрнім пасяджэнні з'езда старшынствуючы таварыш М. С. Хрушчоў паведамляе аб тым, што Пленум Цэнтральнага Камітэта, які адбыўся, выбраў Прэзідыум ЦК, Сакратарыят ЦК, зацвердзіў старшыню Камітэта Партыйнага кантролю пры ЦК КПСС і першага намесніка старшыні Камітэта Партыйнга Кантролю. Ён паведамляе таксама, што Цэнтральная Рэвізійная Камісія выбрала старшыню Камісіі.

Прэзідыум ЦК зацвердіў Бюро ЦК па РСФСР.

Пасля дакладаў камісій былі аднагалосна прыняты Рэзалюцыя XXII з'езда па Справаздачы Цэнтральнага Камітэта КПСС, Праграма КПСС і Статут КПСС.

З кароткай заключнай прамовай выступае таварыш М. С. Хрушчоў. Ён аб'яўляе XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза закрытым. Дэлегаты і госці з вялікім натхненнем выконваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал».

## З табой нашы сэрцы, партыя!

### Студэнты і выкладчыкі БДУ адабраюць рашэнні XXII з'езда КПСС

*Незабыўнай застанецца ў памяці мільёнаў людзей другая палова кастрычніка. У Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, ішло абмеркаванне Справаздачнага даклада і даклада аб Праграме Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, з якімі выстпіў на XXII з'ездзе КПСС М. С. Хрушчоў.*

*З вялікай увагай сачылі студэнты БДУ за работай гістарычнага з'езда. А 31 кастрычніка ва універсітэце прайшлі мнагалюдныя мітынгі. Студэнты і выкладчыкі далучылі свае галасы да голасу ўсяго савецкага народа, які горача адабрае рашэнні XXII з'езда КПСС.*

*Пасля лекцый сабраліся ў актавай зале студэнты філалагічнага факультэта. Першай бярэ слова сакратар партбюро факультэта В. А. Захарава.*

*— Позіркі людзей ўсяго свету накіраваны да Крамлёўскага Палаца з'ездаў, дзе сабраліся лепшыя сыны і дочкі народа. Абмеркаванне праграмы пабудовы камунізма яшчэ раз паказала, што мы ўзняліся на такую вышыню, з якой можна бачыць камунізм як канкрэтную і рэальную справу, падуладную волі партыі і народа.*

*Далей тав. Захарава з гневам гаворыць аб нікчэмнай антыпартыйнай фракцыйнай групе, якая не траціла надзеі вярнуцца да старых метадаў кіраўніцтва.*

*— Савецкія людзі на поўныя грудзі дыхаюць цяпер свежым паветрам, якое змяніла застойлівую і ўдушлівую атмасферу часоў культу асобы. Уся наша партыя, увесь савецкі народ даюць рашучы адпор фракцыянерам і заяўляюць: звароту да старога больш не будзе, — заяўляе дацэнт кафедры партыйна-савецкага друку М. С. Зярніцкі.*

*Адзін за другім змяняюцца прамоўцы на трыбуне. І кожны з іх пачынае свае выступленне аб тым гарачым адабрэнні, якое выказаў савецкі народ новай Праграме Камуністычнай партыі, аб цвёрдай рашучасці нашага народа здзейсніць прадвызначэнні партыі. А. Капусцін, Я. Сяліцкі, М. Казлова, Л. Скалубовіч і іншыя ад імя ўсіх студэнтаў факультэта заявілі: мы гатовы выканаць любое даручэнне партыі!*

*С. А. Лысенка зачытвае праект рэзалюцыі мітынгу. У адказ падымаецца лес рук, студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта адабраюць палітычную лінію і практычную дзейнасць Цэнтральнага Камітэта, новую Праграму нашай партыі.*

□

*Мітынгі і сходы адбыліся на ўсіх факультэтах універсітэта. У прынятых рэзалюцыях студэнты і выкладчыкі аднадушна адабраюць гістарычныя рашэнні XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.*

## З ВЯЛІКІМ СВЯТАМ!

ВІНШУЕМ УСІХ СТУДЭНТАЎ, АСПІРАНТАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ, РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА СА СЛАЎНЫМ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ СВЯТАМ—44-ай ГАДАВІНАЙ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ! ЖАДАЕМ УСІМ НОВЫХ ПОСПЕХАЎ У ВУЧОБЕ, РАБОЦЕ І Ў АСАБІСТЫМ ЖЫЦЦІ!

**РЭКТАРАТ,**
**ПАРТКОМ БДУ,**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**






# Дзе пачынаўся шлях партыі

У дні, калі ў сталіцы нашай Радзімы праходзіў XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, група студэнтаў першага курса геаграфічнага факультэта наведала Дом-музей першага з'езда РСДРП.

З вялікай цікавасцю студэнты азнаёміліся з гістарычнымі дакументамі 1-га з'езда партыі. Міжволі сапастаўляеш, які вялікі і слаўны шлях прайшла наша родная Камуністычная партыя, ад невялікіх гурткоў сацыял-дэмакратаў да шматмільённай маналітнай партыі камуністаў-аднадумцаў.

У Мінску ў 1898 годзе засядалі 9 дэлегатаў ад першых сацыял-дэмакратычных арганізацый, а ў Маскве на гістарычным XXII з'ездзе Камуністычнай партыі сабралася звыш 5 000 лепшых сыноў і дачок нашай цудоўнай Радзімы, каб зацвердзіць праграму пабудовы камуністычнага грамадства. А дзе праходзілі з'езды? Невялікі домік над Свіслаччу і грандыёзны Крамлёўскі Палац з'ездаў — новае цудоўнае збудаванне са шкла і мармуру.. Якая розніца!

Радасна становіцца ад думкі, што сучаснае пакаленне будзе жыць пры камунізме.

— Вялікае дзякуй партыі за яе клопаты аб народзе! — вось што запісалі першакурснікі ў кнізе наведвальнікаў Дома-музея 1-га з'езда РСДРП.

І. ЛЯСКОЎСКІ,
сакратар камсамольскага бюро першага курса геафака.

# Які́м будзе чалавек будучага

2 лістапада адбылася цікавая размова студэнтаў універсітэта з выкладчыкам кафедры педагогікі і псіхалогіі Р. І. Вадэйкам. Тэма гутаркі «Аб культуры паводзін савецкага маладога чалавека—будаўніка камунізма».

У сваёй лекцыі тав. Вадэйка прывёў шматлікія прыклады з жыцця маладзёжных брыгад, брыгад камуністычнай працы, гаварыў аб маральным вобліку савецкага юнака: рабочага, студэнта, вучня, калгасніка.

Тав. Вадэйка адказаў таксама на пытанні, якія задалі яму студэнты.

А. МАМАНТАЎ.

# Заглянем у лабараторыі...



**НА ДРУГІМ КУРСЕ** фізічнага факультэта добра ведаюць камсамольца Генадзія Гарэліка. Ён—выдатнік вучобы. Таварышы палюбілі яго за прамы прынцыповы характар, абралі яго сваім важаком—камсоргам групы.

НА ЗДЫМКУ: Г. Гарэлік у фізічнай лабараторыі вызначае ёмкасць кандэнсатара метадам маста.

Фота Л. КУЗЬМІЦКАГА.

# РАШЭННІ ПАРТЫІ Ў ЖЫЦЦЁ

*Ва універсітэце пачалася падрыхтоўка новых кадраў прапагандыстаў, якія пасля сканчэння курсаў атрымаюць права растлумачваць насельніцтву характар апошніх пастаноў і рашэнняў кіруючых органаў партыі.*

*На курсах займаецца 100 чалавек, лепшыя студэнты трэціх, чацвёртых і пятых курсаў універсітэта. Слухачы будуць два разы ў месяц слухаць лекцыі, якія ім прачытаюць выкладчыкі кафедр грамадскіх навук Н. Г. Крыцько, Т. А. Базылеў, В. М. Тамашэвіч і іншыя.*

## ВЫСТУПАЕ УРАЧ

# Дарагія грамы жыцця

*Каб папраўіць здароўе хвораму, а часта і вярнуць яму жыццё, прымяняюцца самыя разнастайныя лекавыя прэпараты, у тым ліку і кроў здаровага чалавека. Гэты цудадзейны сродак выкарыстоўваецца пры вялікім крывецячэнні ў час складаных аперацый, пры хваробах крыві, пры цяжкіх апёках.*

*Вось тут і прыходзяць на дапамогу хворым шчодрыя дарыцелі, якія даюць сваю кроў для лячэбных мэт. Заўважце, слова «донар» паходзіць ад латынскага «донарэ», што значыць «дарыцель».*

*Кроў чалавека выкарыстоўваецца, галоўным чынам, пры пераліванні. Вельмі часта пераліванне крыві літаральна ўваскрашае людзей, якія знаходзіліся на крок ад смерці. Хіба маглі б хірургі праводзіць складанейшыя аперацыі на лёгкіх, страваводах, страўніках або на сэрцы, калі б не мелі магчымасці заўсёды атрымаць неабходную для хворага кроў? Пры некаторых аперацыях хворы атрымлівае 1,5—2 літры крыві.*

*У аснову донарства пакладзены высакародны прынцып таварыскай узаемадапамогі. Савецкія донары—гэта рабочыя, служачыя, хатнія гаспадыні, студэнты. Усе яны імкнуцца да аднаго—прынесці карысць хвораму чалавеку.*

*Дзякуючы пераліванню крыві ў гады Вялікай Айчыннай вайны былі выратаваны многія параненыя. Яны вярнуліся ў строй, зноў абаранялі любімую Айчыну. Многія з іх, былых хворых, працягваюць выконваць свой грамадзянскі доўг і зараз—у мірныя дні.*

*Усё гэта дзякуючы выдатным патрыётам Радзімы, донарам ваенных гадоў. Іх слаўныя рады папаўняюцца маладдзю.*

*Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Леніна можа ганарыцца сваімі студэнтамі, якія ўжо неаднаразова аддавалі кроў для выратавання жыцця савецкіх грамадзян.*

*Ці шкодна донарства?*

*Даказана навукова, што здача 250—400 грамаў крыві не шкодзіць здароваму чалавеку. Яна хутка ўзнаўляецца ў арганізме. Кожны здаровы чалавек можа стаць донарам. Трэба памятаць, што чым больш донараў, тым больш выратаваных жыццяў.*

*Мы ўпэўнены, што студэнты універсітэта падтрымаюць патрыятычны пачын ленінградскіх, маскоўскіх і мінскіх донараў. Бо кожны грам крыві, зданы ў медыцынскую ўстанову, ідзе для лячэння людзей пры цяжкіх захворваннях.*

*Пра донараў можна сказаць — гэта людзі высокай, прыгожай і чыстай душы!*

*Т. МАЗАВА,*
*урач медпункта БДУ.*

# Заглянем у лабараторыі...



**КАМСОРГА** Вячаслава Мараxоўскага ведаюць не толькі на нашым курсе. Працалюбівы, актыўны і нястомны, ён карыстаецца заслужанай павагай.

Вячаслаў закончыў сярэднюю школу ў 1959 годзе. Не раздумваў, куды ісці працаваць. Яго цягнула радыётэхніка. Яшчэ ў школе ён быў заўзятым радыёаматарам. Змайстраваў магнітафон, збіраў радыёпрыёмнікі. Таму і падаўся юнак на радыёзавод.

А ў 1960 годзе паступіў ва універсітэт. Яго часта можна бачыць у фізічных лабараторыях за работай над схемамі. Я не памылюся, калі скажу, што Вячаслаў будзе выдатным спецыялістам!

Л. ШЫБКО,
студэнт II курса фізфака.

НА ЗДЫМКУ: В. Мараxоўскі вымярае велічыню пераменнага току і зрух фаз паміж токам і напружаннем пры дапамозе ватметраў.

# фізкультура і спорт

## АПОШНІЯ АКОРДЫ ЛЕТНЯГА СЕЗОНУ

*Спартыўны агляд*

Скончылася лета. Падзьмулі асеннія халады, дрэвы страсаюць апошняе лісце, усцілаючы ўсё навокал. Заканчваецца летні спартыўны сезон. Усё менш і менш можна сустрэць спартсменаў на стадыёнах і ўсё часцей гучаць удары па мячу, звон сталёвай штангі у спартыўных залах.

Летні спартыўны сезон быў багаты мерапрыемствамі, і асабліва ў легкаатлетаў.

Апошнім акордам быў для іх масавы асенні крос. У ім прымалі ўдзел каля 1400 студэнтаў. Як і раней, мацнейшымі аказаліся гісторыкі, фізікі і юрысты. Аднак, як паказвае практыка, наступіў момант, калі ў далейшым такія кросы праводзіць нямэтазгодна. Гэта не садзейнічае выяўленню здольных спартсменаў. Значна лепш ад кожнага факультэта вылучаць 20 працэнтаў трэніраваных спартсменаў і праводзіць сярод іх фінальныя кросы. А папярэдне наладжваць факультэцкія кросы.

Удала выступілі нашы спартсмены ў эстафеце, прысвечанай 41-й гадавіне камсамола Беларусі. Яны занялі першае месца сярод калектываў фізкультуры, апярэдзіўшы каманду ІФК.



*Нядрэнны вынік паказаў студэнт філфака Мікалай Гаўрычэнка у час асенняга кросу.*

На здымку: М. Гаўрычэнка на дыстанцыі.

Фота Л. КУЗЬМІЦКАГА.

# ВЫДАТНЫ ПОСПЕХ

*Усё больш паспяховымі становяцца выступленні турыстаў нашага універсітэта на спаборніцтвах па турысцкаму двухбор'ю.*

*У канцы кастрычніка адбылося першынство рэспубліканскага спартыўнага таварыства «Буравеснік» па турызму. Першая каманда універсітэта ў складзе студэнтаў-фізікаў Люцко, Канашовай, Берзіна і Шпінькова стала пераможцай гэтых спаборніцтваў. Каманда ўзнагароджана кубкам і дыпломам I ступені.*

*Адначасова адбывалася першынство горада па гэтаму віду спорта. Тут змагаліся два калектывы універсітэта і дабіліся нядрэнных вынікаў. Другая каманда БДУ заняла II месца сярод 28 каманд горада Мінска.*

*Поспехі турыстаў з'явіліся вынікам вялікай работы, якую праводзіць секцыя турызма-альпінізма. Лік удзельнікаў яе перавысіў 150 чалавек.*

*В. ПРАКОШЫН.*

**Матэрыялы аб летніх паходах удзельнікаў секцыі турызма-альпінізма будуць змешчаны ў адным з нумароў нашай газеты.**

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон: 2-07-19.
АТ. 06703. Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР. Зак. 2241